# ЛІСТ МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ 29.05.2023 № 04-10/4606

МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ
па запаўненні пашпарта матэрыяльнай
гісторыка-культурнай каштоўнасці
і афармлення ліста змяненняў

Дадзеныя метадычныя рэкамендацыі вызначаюць парадак запаўнення пашпарта матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей – пашпарт) і афармлення ліста змяненняў, формы якіх у адпаведнасці з артыкулам 100 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс) устаноўлены пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 28.12.2016 № 89 (рэд. ад 24.11.2022).

**1. Агульныя палажэнні.**

1.1. Пашпарт з'яўляецца асноўным уліковым дакументам, у якім указваюцца поўныя навуковыя і фактычныя звесткі аб матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей – ГКК).

1.2. Складанне пашпарта ГКК забяспечваецца ўласнікам (карыстальнікам) матэрыяльнай ГКК, землекарыстальнікам, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная ГКК, у двухмесячны тэрмін з дня надання матэрыяльнай культурнай каштоўнасці статусу ГКК і ажыццяўляецца за кошт сродкаў яе ўласніка (карыстальніка), землекарыстальніка, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная ГКК, а таксама іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

1.3. Пашпарт складаецца навуковымі арганізацыямі, музеямі, а таксама праектнымі арганізацыямі, якія ажыццяўляюць распрацоўку навукова-праектнай дакументацыі, у штаце якіх працуюць спецыялісты з вопытам работы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны не менш за два гады.

1.4. У выпадку змянення звестак аб гісторыка-культурнай каштоўнасці асобамі, упаўнаважанымі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, не пазней за сем каляндарных дзён з дня атрымання новых звестак, афармляюцца новыя звесткі на асобным лісце змяненняў.

1.5. Пашпарт і ліст змяненняў запаўняюцца ў трох экзэмплярах. Адзін экзэмпляр захоўваецца ва ўласніка (карыстальніка) матэрыяльнай ГКК або землекарыстальніка, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная ГКК, другі – у Міністэрстве культуры, трэці – у мясцовым выканаўчым і распарадчым органе базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, на тэрыторыі якога знаходзіцца матэрыяльная ГКК.

На комплексную ГКК, у склад якой уваходзяць нерухомыя матэрыяльныя ГКК, якія належаць розным уласнікам (карыстальнікам) і (або) размешчаны на зямельных участках, якія належаць розным землекарыстальнікам, пашпарт і ліст змяненняў запаўняюцца ў двух экзэмплярах. Адзін экзэмпляр захоўваецца ў Міністэрстве культуры, другі – у мясцовым выканаўчым і распарадчым органе, на тэрыторыі якога знаходзіцца комплексная ГКК.

1.6. Наяўнасць экземпляраў пашпарта і лістоў змяненняў забяспечвае адпаведны мясцовы выканаўчы і распарадчы орган базавага тэрытарыяльнага ўзроўню.

1.7. Накіраванне экземпляра пашпарта (ліста змяненняў) ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Інструкцыяй па справаводству ў дзяржаўных органах, іншых арганізацыях, зацверджанай пастановай Міністэрства юстыцыі ад 19.01.2009 № 4 (рэд. ад 30.08.2022).

У выпадку неадпаведнасці патрабаванням заканадаўства аб культуры пашпарт (ліст змяненняў) вяртаецца на дапрацоўку ў адпаведнасці з заканадаўствам аб справаводстве не пазней за месячны тэрмін з дня рэгістрацыі ў дзяржаўным органе суправаджальнага ліста аб накіраванні экзэмпляраў адпаведных дакументаў.

1.8. Пашпарт (ліст змяненняў) афармляецца на адным баку вертыкальна размешчаных лістоў паперы фармату А4. Колькасць лістоў, адведзеных для запаўнення раздзелаў пашпарта (ліста змяненняў), не абмежавана.

Афармленне пашпарта (ліста змяненняў) ажыццяўляецца з дапамогай тэхнічных сродкаў. Унясенне тэкставых звестак ўручную, а таксама прыпіскі, закрэсленыя словы і іншыя выпраўленні не дапускаюцца.

Пры запаўненні пашпарта (ліста змяненняў) тэкст друкуецца на беларускай мове міжрадковым інтэрвалам 1 з рэкамендуемай гарнітурай шрыфта Times New Roman кегелем шрыфта 12 пунктаў для падрадковага тэкста і кегелем шрыфта 14 для асноўнага тэкста.

На кожным лісце пашпарта (акрамя тытульнага (першага) ліста) у верхнім полі па цэнтры прастаўляецца парадкавы нумар ліста арабскай лічбай (лічбамі). У выпадку запаўнення некалькіх лістоў змяненняў на дадзеных лістах прастаўляюцца іх парадкавыя нумары арабскімі лічбамі (*ліст змяненняў № 1, ліст змяненняў № 2 і г. д.*);

1.9. З улікам таго, што згодна пунктам 7 – 9 артыкула 100 Кодэкса ўнясенне змяненняў у пашпарт адносіцца да выключнай кампетэнцыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, да новых звестак аб ГКК, якія атрымліваюць выканкамы, адносяцца:

1.9.1. звесткі аб змяненнях ***шыфра, назвы, катэгорыі, датаванні, месца знахождання (адраса) ГКК,*** унесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей – Дзяржспіс) рашэннем Міністэрства культуры, якое даводзіцца да ведама юрыдычных асоб, грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, шляхам яго размяшчэння не пазней за дзесяць рабочых дзён з дня яго прыняцця на афіцыйным сайце Міністэрства культуры ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт (пункт 6 артыкула 97, пункт 6 артыкула 98 Кодэкса, раздзел "Спадчына" сайта Міністэрства культуры па спасылцы: *kultura.by/nasledie/);*

1.9.2. звесткі аб ***сучасным месцы знаходжання, адрасе ГКК*** па выніках змяненняў назваў населеных пунктаў, вуліц, змянення (удакладенення) адрасоў, інвентарных нумароў на падставе рашэнняў мясцовых органаў кіравання і самакіравання згодна з Дзяржаўным каталогам найменняў геаграфічных аб'ектаў Рэспублікі Беларусь (*maps.by*), рэестрам адрасоў Рэспублікі Беларусь і адзіным дзяржаўным рэгістрам нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй (*gzk.nca.by*)

1.9.3.звесткі аб ***сучасным выкарыстанні ГКК***;

1.9.4. звесткі аб ***новым уласніку (карыстальніку) матэрыяльнай ГКК***, землекарыстальніку, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная ГКК, якія падпісалі ахоўнае абавязацельства, ***лакалізацыі валодання ГКК, даты наступлення, заканчэння правоў уласнасці, даты і нумара рэгістрацыі ахоўнага абавязацельства***, а таксама новыя звесткі аб ***адметных вартасцях, элементах, дэталях, якія падлягаюць абавязкова ахове***, індывідуальных ўмовах утрымання і выкарыстання ГКК, які фіксуюцца мясцовымі органамі пры запаўннні ахоўных абавязацельств (пункт 1 артыкула 121 Кодэкса, пункт 9.6 ахоўнага абавязацельства);

1.9.5. новыя ***гістарычныя звесткі***, у тым ліку аб асноўных этапах фарміравання і развіцця, падзеях і асобах, звязаных з гісторыка-культурнай каштоўнасцю, гісторыі даследаванняў да нашых дзён уключна, матэрыялы фотафіксацыі і графічныя матэрыялы комплексных навуковых вышуканняў, выкананых па заказу мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў пры распрацоўцы праектаў зон аховы нерухомых матэрыялных ГКК, матэрыялы навукова-даследчых работ у складзе навукова-праектнай дакументацыі (артыкулы 105, 112 Кодэкса);

1.9.6. звесткі аб новых ***праектах зон аховы нерухомых матэрыяльных ГКК***, якія публікуюцца на Нацыянальным прававым Інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь (*pravo.by*), а таксама даводзяцца да ведама распрацоўшчыка і адпаведнаму выканкаму згодна з пунктам 47 Інструкцыі аб парадку распрацоўкі праектаў зон аховы нерухомых

матэрыяльных ГКК, зацверджанай пастановай Міністэрства культуры ад 06.07.2022 № 52;

1.9.7. ***звесткі аб праведзеных работах*** *на ГКК (артыкул 114 Кодэкса);*

1.9.8. звесткі аб ***узгадненні навукова-праектнай дакументацыі***, аб ***прыняцці ў эксплуатацыю*** нерухомай матэрыяльнай ГКК, на якой выконваліся рамонтна-рэстаўрацыйныя работы (артыкулы 119, 120 Кодэкса);

1.9.9. ***ілюстрацыйныя матэрыялы***, у тым ліку ***актуальныя фотаздымкі***, выкананыя пры ажыццяўленні мерапрыемстваў прафілактычнага характару (агляды, маніторынгі і інш.) згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі ад 16.10.2009 № 510, ***карты*** (Публічная кадастравая карта Рэспублікі Беларусь (*map.nca.by*), Геапартал зямельна-інфармацыйнай сістэмы Рэспублікі Беларусь (*gismap.by*), ***схемы*** (матэрыялы навукова-праектнай дакументацыі, ПЗА), ***планы*** (тэхнічны пашпарт, пашпарт невыкарыстоўваемага аб’екта) і інш.

1.9.10. звесткі аб ГКК, атрыманыя ў ходзе яе вывучэння, а таксама дадзеныя, якія знаходзяцца ў Банку звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь (heritage.gov.by).

*Даведачна: Спіс карыстальнікаў Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь разам з Інструкцыяй па рабоце з інфармацыйным рэсурсам для спецыялістаў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў накіраваны ў адрас зацікаўленых лістом Міністэрства культуры ад 06.02.2023 № 04-09/1118.*

1.10. Пашпарт разам з лістамі змяненняў падлягае пастаяннаму захаванню.

**2. Запаўненне рэквізітаў пашпарта.**

2.1. Пры запаўненні пашпарта ў рэквізіце “***назва і месца знаходжання***” указваюцца назва і месца знаходжання (адрас) матэрыяльнай ГКК згодна з **Дзяржспісам**.

*Даведачна: Дзяржспіс ў якасці асноўнага дакумента ўліку ГКК зацверджаны пастановай Міністэрства культуры ад* ***03.01.2023 № 1****, а таксама ў якасці дзяржаўнага інфармацыйнага рэсурса даступны па спасылцы:* **gosspisok.gov.by***.*

*Графы Дзяржспіса запаўняюцца ў адпаведнасці з* ***пунктам 1 артыкула 98 Кодэкса****, а таксама Рэгламентам вядзення Дзяржспіса, зацверджаным загадам Міністэрства культуры ад* ***03.01.2023 № 1****.*

Пры складанні пашпарта на ГКК, якая знаходзіцца ў складзе комплекснай ГКК дапускаюцца наступныя варыянты напісання яе назвы: “*Сядзіба Умястоўскіх: палац, Гродзенская вобласць, Іўеўскі раён, аграгарадок Жамыслаўль*” альбо “*Палац у складзе сядзібы Умястоўскіх, Гродзенская вобласць, Іўеўскі раён, аграгарадок Жамыслаўль*”

Ніжэй указваецца пасада кіраўніка і назва арганізацыі, якая запоўніла пашпарт, подпіс кіраўніка, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца), прозвішча кіраўніка.

Рэквізіты “***Назва навуковай арганізацыі, музея, праектнай арганізацыі***”, “***Подпіс***” засведчваюцца подпісам кіраўніка арганізацыі, адказнай за запаўненне пашпарта. Для навуковых арганізацый, музеяў рэкамендуецца прастаўленне пячаткі арганізацыі.

Дапускаецца афармленне адзначаных рэквізітаў у выглядзе тытульнага ліста да пашпарта.

2.2. Пры запаўненні рэквізітаў “***1. Назва***”, “***2. Шыфр***”, “***3. Катэгорыя***” пазначаюцца звесткі згодна з Дзяржспісам.

Звесткі аб даце і нумары, назве прававога акта, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, і дзяржаўнага органа, які яго прыняў, запаўняюцца ў адпаведнасці з падпунктам 1.7 пункта 1 артыкула 98 Кодэкса і графой 7 Дзяржспіса.

Пры наяўнасці прававых актаў, якімі ўносіліся змяненні ў Дзяржспіс, дапускаецца іх фіксацыя пасля назвы прававога акта, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

**Напрыклад:**

“*пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14.05.2007 № 578 (рэд. ад 02.08.2016) “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей”,*

*пастанова Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 20.08.2021 № 55 “Аб гісторыка-культурных каштоўнасцях*”.

2.3. Рэквізіт “***4. Від матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці***” запаўняецца ў адпаведнасці з нормамі артыкула 83, пункта 2 артыкула 98 Кодэкса і правяраецца значэннем чацвёртага знака шыфра ГКК.

2.4. У рэквізіт “***5. Месца знаходжання матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці (па сучасным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле)***” ўносяцца звесткі аб месцы знаходжанні ГКК згодна з Дзяржспісам і рэестрам адрасоў Рэспублікі Беларусь: вобласць, раён, населены пункт, плошча, вуліца, завулак, нумар будынка, (інвентарны нумар ці ліцер пры неабходнасці).

*Даведачна: Вядзенне рэестра адрасоў Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад* ***09.04.2012 № 160*** *(рэд. ад 17.10.2022) “Об адресной системе”.*

*Падставы назначэння і парадак тэхнічнай інвентарызацыі нерухомай маёмасці, а таксама праверкі характарыстык нерухомай маёмасці пры ажыццяўленні рэгістрацыйных дзеянняў рэгулююцца Інструкцыяй, зацверджанай пастановай Дзяржаўнага камітэта па маёмасці ад* ***24.03.2015 № 11*** *(рэд. ад 14.03.2023).*

*Парадак вырабу пашпарта невыкарыстоўваемага аб’екта рэгулюецца Інструкцыяй, зацверджанай пастановай Дзяржаўнага камітэта па маёмасці ад* ***06.01.2023 № 2****.*

Рэквізіт “раён” не запаўняецца (ставіцца прочырк) у сталіцы, абласных цэнтрах, гарадах абласнога падпарадкавання, якія маюць гарадскія выканаўчыя камітэты.

Рэквізіты “плошча”, “вуліца”, “завулак” і “нумар будынка” не запаўняюцца, калі ГКК знаходзіцца за межамі населенага пункта. У гэтым выпадку ўносяцца спасылкі на ўрочышча або прыродныя арыенціры, якія маюць доўгатэрміновы характар.

Пры знаходжанні ГКК на землях ляснога фонда дапускаецца ўказанне нумару квартала і выдзела.

**Напрыклад:**

*“Брэсцкая вобласць, Пінскі раён, в. Ласіцк, 1 км на захад, на левым беразе р. Стыр, на пясчаным узгорку, у лесе (квартал 46, выдзелы 21, 23, 28, 29)”.*

У выпадку, калі пры вывучэнні ГКК былі выкарыстаны прыборы спадарожнікавай навігацыі, уносяцца звесткі аб каардынатах размяшчэння.

**Напрыклад:**

*“Магілёўская вобласць, Бабруйскі раён, в. Шчаткава, 0,9 км на паўночны захад ад вёскі, за 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі Панюшкавічы, на першай надпоплаўнай тэрасе правага берага р. Бярэзіна, за 0,2 км на паўднёвы ўсход ад вусця р. Панюшкавічы, з усходняга боку гарадзішча, урочышча Гарадок, геаграфічныя каардынаты: 53º14'03.21"С 29º10'48.35"В”.*

*Даведачна: Афармленне каардынат межаў ГКК ажыццяўляецца з ўлікам патрабаванняў артыкула 125 Кодэкса, а таксама Інструкцыі аб парадку распрацоўкі праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, зацверджанай пастановай Міністэрства культуры ад 06.07.2022 № 52.*

Пры выяўленні падчас запаўнення рэквізіта неадпаведнасці звестак аб адрасе ГКК у Дзяржспісе звесткам, якія ўтрымліваюцца ў рэестры адрасоў Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ў парадку, устаноўленым абзацам пятым пункта 6 артыкула 97 Кодэкса, загадам Міністэрства культуры ад 03.01.2023 № 1, накіроўваюць адпаведныя звесткі ў Міністэрства культуры.

2.5. У рэквізіце “***6. Гістарычны адрас (на момант узнікнення матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці і наступныя змены адраса)***” пазначаецца гістарычны адрас на момант узнікнення ГКК і наступныя змены адраса да нашых дзён з указаннем гістарычных дзяржаўных фарміраванняў, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак на тэрыторыі сучаснай Беларусі, на тэрыторыі якіх знаходзілася ГКК.

**Напрыклад:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| *6. Гістарычны адрас (на момант узнікнення матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці і* | *Верхнедняпроўская культура (археалагічная культура позняга неаліту)<br>(4-3 тыс. до н.э.)* | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| *наступныя змены адраса)* | *Днепра-двзінская культура (археалагічная культура жалезнага веку) (VIII ст. да н.э.– IV ст. н.э.)*<br><br>*Радзімічы (саюз плямён)*<br><br>*Мсціслаўскае княства (XII – XV стст.)*<br><br>*Вялікае Княства Літоўскае (XV – XVI стст.)*<br><br>*Рэч Паспалітая (XVI ст. – 1772 г.)*<br><br>*Расійская імперыя (1772 – 1796 гг.), Магілёўскае намесніцтва*<br><br>*Расійская імперыя (1796-1802 гг.), Беларуская губерня*<br><br>*Расійская імперыя (1802-1917 гг.), Магілёўская губерня*<br><br>*РСФСР (1917 – 1919 гг.), Магілёўская губерня*<br><br>*РСФСР (1919-1924 гг.), Гомельская губерня*<br><br>*БССР (1924-1927 гг.), Калінінская акруга*<br><br>*БССР (1927-1991 гг.), Магілёўская вобласць*<br><br>*Рэспубліка Беларусь (з 1991 г.), Магілёўская вобласць* | *Мсціслаўскае старасТва*<br><br>*Мсціслаўскае старасТва*<br><br>*Клімавіцкі павет*<br><br>*Клімавіцкі павет*<br><br>*Клімавіцкі павет*<br><br>*Клімавіцкі павет*<br><br>*Клімавіцкі павет*<br><br>*Клімавіцкі раён*<br><br>*Клімавіцкі раён*<br><br>*Клімавіцкі раён* | *в. Барысавічы*<br><br>*в. Барысавічы*<br><br>*в. Барысавічы*<br><br>*в. Барысавічы*<br><br>*в. Барысавічы*<br><br>*в. Барысавічы*<br><br>*в. Барысавічы*<br><br>*в. Барысавічы*<br><br>*в. Барысавічы* |

Тыповай памылкай з’яўляецца пазначэнне гістарычнага адрасу толькі з моманту ўзяцця аб’екта спадчыны пад ахову дзяржавай альбо з моманту яе адкрыцця і вывучэння (напрыклад, помнікаў археалогіі).

Змены гістарычных адрасоў (гістарычных дзяржаўных фарміраванняў) можна лёгка прасачыць нават для ГКК, якія налічваюць некалькі тысячагоддзяў, з дапамогай спецыялізаваных крыніц.

**Напрыклад:**

*Нацыянальны атлас Беларусі. Мн.: Белкартаграфія, 2002. – 292 с.;*

*Вялікі гістарычны атлас Беларусі. У 4-х тамах. Мн.: Белкартаграфія, 2009 –2018.*

*Археалогія Беларусі у 4-х тамах. Мінск, 1997 – 2001.*

*Гісторыя Беларусі ў 6-х тамах. Касцюк М. (рэд.) Мн. 2000 – 2011*

2.6. Рэквізіт “***7.1. Архітэктурны стыль матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці***” вызначаецца ўстойлівымі архітэктурнымі, канструктыўнымі, кампазіцыйнымі, пластычнымі, каларыстычнымі, рытмічнымі і іншымі мастацкімі адзнакамі і з’яўляецца характэрным для таго або іншага часу, напрыклад, “класіцызм”, “віленскае барока”, “сацыялістычны рэалізм” і г. д.

Для вызначэння стыляў і іх характэрных адметнасцей рэкамендуецца выкарыстоўваць профільныя слоўнікі ці энцыклапедыі.

**Напрыклад:**

Архітэктура Беларусі: энцыклапедычны даведнік: рэдкал.: А.А. Воінаў [і інш.] БелЭн, 1993;

Слоўнік тэрмінаў: Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: [каля 800 тэрмінаў]: дапаможник для вучняў / Б. А. Лазука, Мінск : Беларусь, 2001.

Для помнікаў археалогіі, альбо для ГКК, звесткі аб стылі якіх не ўдалося высветліць, ставіцца прочырк у дадзеным рэквізіце.

2.7. У рэквізітах “7***.2. Узнікненне, віды работ***”, “***Дата***”, “***Стваральнік або аўтар***” пазначаецца гісторыя фармавання гісторыка-культурнай каштоўнасці з пазначэннем абставін, якія папярэднічалі ўзнікненню (рашэнне аб пабудове, час праектавання), час пачатку і заканчэння работ, відаў і абставін, пры якіх адбывалася пабудова і іншае.

**Напрыклад:**

| 7.2. Узнікненне, віды работ | Дата | Стваральнік або аўтар |
|---|---|---|
| Будаўніцтва сядзібнага дома з гаспадарчымі пабудовамі (пачатак фарміравання парка з садамі) | 1793 г. | Стваральнік - Францішак Ксаверый Чарноцкі |
| Будаўніцтва капліцы | 1811 г. | - |
| Рэканструкцыя сядзібнага дома /расшырэнне сядзібы за кошт прыбудовы бакавых крылаў | 1850 г. | - |
| Будаўніцтва афіцыны (паздней – бібліятэка) | 1850 г. | - |
| Работы па рамонту і абнаўленні сядзібы | з 1905 г. | Стэфан Чарноцкі |
| Далейшае фарміраванне сядзібна-паркавага комплексу | кан. XIX - пач. XX ст. | - |
| Разбурэнне сядзібнага дома | канец 1939 г. | - |
| Разбурэнне і страта асноўных пабудоў сядзібы | 1941-1945гг. | - |

| | | |
|---|---|---|
| Сельскагаспадарчае асваенне тэрыторыі, якое прывяло да страты агульнай планіроўкі парку і значнай тэрыторыі пладовых садоў. | у перыяд з 1939 г. па 2018 г. | - |
| Стварэнне батанічнага помніка прыроды мясцовага значэння “Дубавыя алеі сядзібы Чарноцкіх” | 2018 г. | - |

Для помнікаў археалогіі ў якасці стваральнікаў могуць указвацца прадстаўнікі адпаведнай археалагічнай культуры.

**Напрыклад:**

| 7.2. Узнікненне, віды работ | Дата | Стваральнік або аўтар |
|---|---|---|
| Узнікненне | X стагоддзе | плямёны дрыгавічоў |
| Помнік фармаваўся да XIII стагоддзя | - | - |

2.8. Гістарычнае і сучаснае выкарыстанне гісторыка-культурнай каштоўнасці фіксуецца ў рэквізіце “***Выкарыстанне***”.

У выпадку, калі ГКК выкарыстоўваецца адначасова ў розных мэтах і знаходзіцца ў валоданні некалькіх уласнікаў, пазначаецца сучаснае функцыянальнае выкарыстанне кожнай часткі ГКК

Назначэнне зямельнага ўчастка, на тэрыторыі якога знаходзіцца ГКК указваецца ў адпаведнасці з класіфікацыяй, устаноўленай заканадаўствам аб землях, і правяраецца з дапамогай Геапартала зямельна-інфармацыйнай сістэмы Рэспублікі Беларусь (gismap.by).

**Напрыклад:**

| | | |
|---|---|---|
| 8. Выкарыстанне | могільнік | землі ляснога фонда, помнік археалогіі |
| | (гістарычнае) | (сучаснае) |

*Даведачна: У адносінах да аб’ектаў нерухомасці, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, альбо зямельных участкаў, занятых ГКК, павінны ўказвацца абмежаванні, звязанныя з наяўнасцю статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці, якія ўказваюцца ў пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў адносінах капітальнага збудавання ці зямельнага ўчастка ў парадку, прадугледжаным пастановай Дзяржаўнага камітэта па маёмасцм ад 25.03.2022 № 11.*

2.9. У рэквізіце “***9. Уласнік (карыстальнік) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, землекарыстальнік, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць***” неабходна поўнасцю пісаць назву юрыдычнай асобы, або прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) фізічнай асобы, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, якая (які) з’яўляецца ўласнікам (уладальнікам) ГКК.

Калі ГКК належаць некалькім уласнікам (уладальнікам), указваюцца ўласнікі (ўладальнікі) усіх частах ГКК, у тым ліку кватэр, нежылых памяшканняў, асобных будынкаў і збудаванняў, зямельных участкаў.

У выпадку, калі ГКК належыць адной асобе, рэквізіт “***Лакалізацыя валодання***” запаўняецца словамі “увесь аб’ект” ці “поўнасцю”. Калі ГКК належаць некалькім уласнікам (уладальнікам), указваюцца межы (долі) ўласнасці або валодання кожнай часткі ГКК (інвентарны нумар будынка, нумар памяшкання, плошча ($м^2$) і інш.).

“***Форма ўласнасці***” можа быць дзяржаўнай (рэспубліканскай ці камунальнай) альбо прыватнай. Для жылых дамоў дапускаецца ўказанне “сумеснае домаўладанне”.

У рэквізіце “***Дата наступлення/заканчэння правоў уласнасці***” запаўняюцца звесткі аб усіх вядомых датах наступлення і заканчэння правоў уласнасці, у выпадку адсутнасці такіх звестак дапускаецца ўказнанне даты рэгістрацыі юрыдычнай асобы.

У рэквізіце “***Ахоўнае абавязацельства (дата і нумар рэгістрацыі)***” указваюцца усе ахоўныя абавязацельствы, падпісаныя з моманту ўключэння ГКК у Дзяржспіс.

**Напрыклад:**

| 9. Уласнік (карыстальнік) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, землекарыстальнік, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць | Лакалізацыя валодання | Форма ўласнасці | Дата наступлення/ заканчэння правоў уласнасці | Ахоўнае абавязацельства (дата і нумар рэгістрацыі) |
|---|---|---|---|---|
| Гарадзейскі пасялковы выканаўчы камітэт | Увесь аб’ект | Дзяржаўная камунальная | 1948 | 02.08.1995<br>№ 1453<br>26.07.2010<br>№ 11-02-07/757<br>26.09.2018<br>№ 6/14/1-18/13 |

Пры запаўненні пашпарта комлекснай ГКК фіксуюцца ўласнікі ўсіх аб’ектаў і частак ГКК, якія ўваходзяць у яе склад.

**Напрыклад:**

| 9. Уласнік (карыстальнік) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, землекарыстальнік, на зямельным участку якога размешчана матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць | Лакалізацыя валодання | Форма ўласнасці | Дата наступлення/ заканчэння правоў уласнасці | Ахоўнае абавязацельства (дата і нумар рэгістрацыі) |
|---|---|---|---|---|
| Нарачанскі сельскі выканаўчы камітэт | Вадаём, рэштderкі дзвух капліц | Дзяржаўная (камуналная) | 1991 | 30.10.2020<br>№ 6/3/1-50/8 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Рэлігійная арганізацыя “Прыход храма Успення Прасвятой Багародзіцы ў в. Ручыца Вілейскага раёна Мінскай вобласці” Маладзечанская епархія БПЦ | Царква | Прыватная | 1995 | 10.05.2018 № 6/3/1-50/17 |

2.10. Рэквізіт “***Тэхнічная характарыстыка (для нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці)***” змяшчае:

“Сучасны тэхнічны стан” – звесткі аб сучасным тэхнічным стане (здавальняючы, нездавальняючы, аварыйны);

“Асноўныя будаўнічыя матэрыялы” – звесткі аб сучасных будаўнічых матэрыялах.

Адпаведныя рэквізіты пашпарта змяшчаюць звесткі аб плошчы забудовы ў квадратных метрах, будаўнічым аб'ёме ў кубічных метрах, агульнай плошчы ў квадратных метрах, вышыні, даўжыні і шырыні гісторыка-культурнай каштоўнасці ў метрах (звесткі запаўняюцца згодна з тэхнічным пашпартам, пашпартам невыкарыстоўваемага аб’екта, а пры іх адсутнасці – згодна з матэрыяламі архітэктурных або археалагічных абмераў).

Для помнікаў гісторыі, археалогіі і мастацтва указваюцца тэхнічныя характарыстыкі па пунктах 10.5 – 10.8 (агульная плошча, вышыня, даўжыня, шырыня), па пунктах 10.2 – 10.4 ставіцца прочырк.

Пры запаўненні пашпарта комплекснай ГКК тэхнічныя характарыстыкі запаўняюцца асобна як для комплекснай ГКК, так і для кожнай ГКК у яе складзе.

2.11. Рэквізіт “***11. Апісанне матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці***” змяшчае агульныя звесткі аб размяшчэнні ГКК у навакольным асяроддзі, яе знешнім выглядзе, аб’емна-прасторавых рашэннях.

Рэквізіт “***Апісанне адметных духоўных, мастацкіх, дакументальных, архітэктурных і (або) канструктыўных вартасцей матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама элементы, канструкцыі, дэталі, якія падлягаюць абавязковаму захаванню***” ўтрымлівае падрабязнае апісанне прадмета аховы, вызначанага ў адпаведнасці з падпунктам 1.3 пункта 1 артыкула 1 Кодэкса, згозна з якім ГКК – культурная каштоўнасць, якая мае адметныя духоўныя, мастацкія, дакументальныя, архітэктурныя і (або) канструктыўныя вартасці і якой нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Адпаведныя звесткі фіксуюцца ў пункце 9.6 ахоўнага абавязацельства.

Пазначаюцца фактычныя адметныя вартасці, апісанне абъёмна-прасторавай і планіровачнай структуры, архітэктурна-мастацкага афармлення фасадаў, прасторава-планіровачнай структуры і дэкаратыўна-мастацкага афармлення інтэр'ераў, наяўнасць або адсутнасць інфармацыйных надпісаў і абазначэнняў, кампазіцыйнай сувязі з побач размешчанымі помнікамі і ландшафтамі (пры наяўнасці).

У залежнасці ад віда ГКК у якасці варстацей і элементаў, якія падлягаюць абавязковаму захаванню, указваюцца:

***для помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва*** – агульнае архітэктурна-прасторавае вырашэнне, гістарычны аб'ем і формы (формы даху, купалоў, башняў), стылістычныя рысы, уласцівыя архітэктурнаму стылю, пазначанаму ў пункце 7.1 пашпарта, а таксама пры наяўнасці канструктыўныя вартасці (аркі, калоны, слупы і г. д.), аўтэнтычныя ваконныя і дзвярныя запаўненні, ганкі і іншыя архітэктурныя дэталі (франтоны, ліштвы, русты, пілястры, карнізы, і г. д.), аўтэнтычны будаўнічы матэрыял, у тым ліку абліцоўка сцен і даху, колеравае вырашэнне фасадаў і даху;

***для паркаў*** – апісанне ландшафта, алеяў, пералік дрэў з указаннем і пароды і ўзросту;

***для помнікаў археалогіі*** – характарыстыка рэльефа ці ландшафта, магутнасць культурнай слоя (пласту), а таксама абавязкова ўказваецца 50 м зона ад вонкавых межаў тэрыторыі помніка археалогіі і апісваецца прававы рэжым утрымання і выкарыстання дадзеных тэрыторый згодна з патрабаваннямі артыкулаў 105, 125 і 130 Кодэкса;

***для помнікі гісторыі*** – апісанне збудаванняў, твораў манументальнага мастацтва, надпісы на помніках, геральдычныя выявы і інш. дакументальныя вартасці.

Для месцаў пахаванняў указваюцца іх межы.

Для ўсіх відаў ГКК апісваецца гістарычнае (духоўнае) значэнне, якое мае ГКК у залежнасці ад катэгорыі: для рэгіёна, нацыянальнае, міжнароднае ці сусветнае значэнне.

У пашпартах комплексных ГКК неабходна апісаць як увесь комплекс, так і кожную ГКК, якая ўваходзіць у яе склад, з пазначэннем адметных вартасцей як комплекснай ГКК, так і кожнай ГКК у яе складзе, іх элементаў, канструкцый, дэталяў, якія падлягаюць абавязковаму захаванню.

2.12. Рэквізіт "***12. Элементы, што маюць самастойны статус матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці***" запаўняецца згодна з Дзяржаўным спісам для комплекснай ГКК, у складзе якой знаходзяцца ГКК, якія маюць самастойны статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, што падцвярджаецца наяўнасцю катэгорый "0", "1", "2",

“3” і шыфрам. У наступных рэквізітах фіксуюцца шыфр, назва, дата і катэгорыя.

**Напрыклад:**

| Шыфр | Назва | Дата | Катэгорыя |
|---|---|---|---|
| 213Г000944 | Спаса-Праабражэнская царква. Роспісы ў інтэр’еры | XII стагоддзе | 0 |
| 212Г000898 | Спаса-Еўфрасіннеўскі храм (цёплая царква) | 1847 год, 1886 год | 3 |
| 213Г000899 | Крыжа-Узвіжанскі сабор | 1893–1897 гады | 2 |
| 213Г000945 | манастырскі корпус (келейны корпус № 2) | пачатак XVIII стагоддзя | 3 |
| 213Г000900 | манастырскі корпус (келейны корпус № 1) | пачатак XX стагоддзя | 3 |
| 213Г000944 | званіца | канец XIX стагоддзя | 3 |

2.13. Рэквізіт “***Гістарычная даведка***” змяшчае звесткі аб гісторыі ўзнікнення, асноўных этапах фармавання і развіцця ГКК, падзеях і асобах, звязаных з ГКК, гісторыю даследаванняў ГКК.

Гістарычная даведка ахоплівае перыяд ад стварэння аб’екта да сучаснасці. Для апісання асноўных этапаў развіцця ГКК дапускаецца ўключэнне ў дадзены пункт гістарычнага ландшафту.

Для комплексных ГКК пазначаецца гісторыя як усей комплекснай ГКК, так і кожнай ГКК у яе складзе.

У залежнасці ад віда ГКК гістарычная даведка ўтрымлівае:

***для помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва*** – звесткі аб часе і абставінах іх стварэння, уладальніках, архітэктарах і будаўніках, перабудовах, стратах, работах па захаванню, звязаныя з помнікам гістарычныя падзеі і асобы, інфармацыю аб этапах работ на ГКК, уключаючы звесткі аб асобах, звязаных з распрацоўкай і рэалізацыяй праектных рашэнняў, прымяняемых пры будаўніцтве матэрыялах;

***для помнікаў археалогіі*** – датаванне, прыналежнасць да той ці іншай археалагічнай культуры, звесткі аб археалагічных вышуканнях, важнейшыях знаходках і месцы іх пастаяннага захоўвання.

***для помнікаў гісторыі і мастацтва*** – звесткі аб гістарычных падзеях і асобах, якія ўвекавечаны, інфармацыя аб часе і абставінах стварэння, у тым ліку ўтварэння мест пахавання, стварэння і рэканструкцыі твораў манументальнага мастацтва, скульптарах і архітэктарах, размешчаным тэксце і выявах, а таксама работах на гэтых помніках.

Гістарычная даведка прадугледжвае фіксацыю гісторыі даследаванняў, у тым ліку даследаванняў, на падставе якіх гэтыя аб'екты былі ўзятыя пад ахову дзяржавай. Да такіх даследаванняў таксама адносяцца натурныя і бібліяграфічныя вышуканні, на падставе якіх унесены змяненні (ўдакладненні) аб назве, датаванні, месцы знаходжанні і катэгорыі ГКК.

**Напрыклад:**

*"Комплекс будынкаў былога манастыра бернардзінак у г. Мінску узяты пад ахову дзяржавай згодна з пастановай Савета Міністраў БССР ад 18.05.1953 № 625.*

*У адпаведнасці з Законам БССР аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры 1978 года і пастановай Савета Міністраў БССР ад 01.10.1984 № 350 па выніках комплексных навуковых дaслеванняў Нацыянальнай акадэміі БССР уключаны ў Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі (у 8 тамах) як помнік архітэктуры. Пастановай Савета Міністраў БССР ад 18.02.1988 № 32 уключаны ў спіс помнікаў гістрыі і культуры рэспубліканскага значэння БССР.*

*У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь 1992 года "Об охране историко-культурного наследия" рашэннем Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытнням аховы гісторыка-культурнай спадчыны (далей – Рада) ад 28.02.2002 № 71 уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь як гісторыка-культурная каштоўнасць нацыянальнага значэння*

*Згодна з пастановай Міністэрства культуры ад 10.04.2003 № 11 меў шыфр 1а1Е400803. Пасля прыняцця пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14.05.2007 № 578 – шыфр 712Г0000080. На падставе навукова абгрунтаванных прапаноў БПЦ Рада рашэннем ад 15.12.2021 № 04-01-02/7 падтрымала неабходнасць удакладнення назвы і адрасоў помніка архітэктуры. Пастановай Міністэрства культуры ад 05.01.2022 № 4 назва ГКК выкладзена "Комплекс будынкаў Свята-Духава кафедральнага сабора (былы клаштар бернардзінцаў)".*

2.14. У рэквізіце "***14. Архіўныя і бібліяграфічныя крыніцы***" фіксуецца спіс асноўных архіўных і бібліяграфічных крыніц, аформлены ў адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 08.09.2016 № 206.

У дадзены пункт пашпарта рэкамендуецца ўключаць спасылкі на нарматыўныя прававыя акты, дзяржаўныя інфармацыйныя рэсурсы, матэрыялы палявых даследаванняў і іншыя крыніцы, якія выкарыстоўваліся пры запаўнні пашпарта.

**Напрыклад:**

1. Аб зацвярджэнні Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: постановление Министерства культуры Республики Беларусь от 03.01.2023 № 1 (рэд. ад 20.03.2023)
2. Альбом. Подвиг советского народа бессмертен: новые экспозиции «Брестской крепости-героя» и Музея Победы на Поклонной горе в г. Москве: к 80-летию начала Великой Отечественной войны. – Минск: Звязда, 2021. – 208 с.: ил.
3. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 1. Каменны і бронзавы вякі / Э. М. Зайкоўскі, У. Ф. Ісаенка, А. Г. Калечыц [і інш.] ; пад рэд. М. М. Чарняўскага, А. Г. Калечыц. — Мінск: Бел. навука, 1997. — С. 23 – 27.
4. Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: heritage.gov.by – Дата доступа: 01.05.2023.
5. Вороненко, О.В. Некоторые данные о состоянии памятников археологии Осиповичского района Могилёвской области / Археология Осиповичского района

Могилёвской области: материалы науч.-практ. конф. Итоги археологического изучения Осиповичского района 10 декабря 2016 года, г. Осиповичи. Минск, 2017. С. 25.

6. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. Рэжым доступа: gosspisok.gov.by. Дата доступа: 01.05.2023.

7. Дубицкая Н.Н. Отчёт о полевых исследованиях в Бобруйском районе Могилёвской области… в 1996 г. № 1630. С. 6.

8. Закон БССР об охране и использовании памятников истории и культуры, Мн., 1978.

9. Закон Республики Беларусь от 13.11.1992 № 1940-XII "Об охране историко-культурного наследия" (в редакции Закона Республики Беларусь от 24 июля 2002 г. № 134-З) // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь – 1992. – № 30. – С. 504.

10. Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" ад 9 студзеня 2006 г. № 98-З // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 17 января 2006 г. – № 2/1195.

11. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэд. Кал.: С.В. Марцэлеў (гал.рэд.) і інш.- Мн.: Беларус. Сав.Энцыклапедыя, 1986, - С. 118. № 376.

12. Об утверждении Государственного списка историко-культурных ценностей Республики Беларусь: постановление Министерства культуры Республики Беларусь от 10.04.2003 № 11 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 28.07.2003, №82, 8/9523.

13. Нацыянальны атлас Беларусі. Мн.: Белкартаграфія, 2002. – 292 с.

14. Копытин В.Ф. Археологические памятники Бобруйского района Могилёвской области. Могилёв: Издательство МГУ им. А.А. Кулешова. 2001. С. 88. № 125.

15. Ксензов В.П. Отчет о полевых археологических работах в 1982 г. ЦНА НАНБ. – ФАНД. Арх. № 809. С. 3.

16. Поболь Л.Д. Отчёт об археологических исследованиях на территории БССР в 1964 г. № 238. л. 155.

17. Хопкинск О., Визуальный словарь архитектуры. – СПб.: Питер, 2023. – 168 с.: ил.

2.15. У рэквізіце "***Наяўнасць распрацаванай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ***" пазначаюцца звесткі аб распрацаванай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ, па якой выдадзена станоўчае заключэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах.

**Напрыклад:**

| Праектная арганізацыя | Назва аб'екта згодна з праектнай дакументацыяй | Шыфр аб'екта | Дата і нумар заключэння |
|---|---|---|---|
| ААТ "РэстаўрацыяІнвест" | Праект "Рэканструкцыя з элементамі рэстаўрацыі сярэдняй школы (гісторыка-культурнай каштоўнасці Палац Радзівілаў) пад культурна-адміністрацыйны цэнтр" | 03.00 | Заключэнне Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 27 сакавіка 2023 г. № 04-01-06/42 |

*Даведачна: З 01.01.2023 у адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 119 Кодэкса навукова-праектная дакументацыя ў дачыненні да нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей **катэгорыі "0", "1", "2" узгадняецца з Міністэрствам культуры** ў парадку, устаноўленым заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах.*

*Навукова-праектная дакументацыя ў дачыненні да нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей* ***катэгорыі “3”*** *узгадняецца з мясцовым выканаўчым і распарадчым* ***органам абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню ў парадку****, устаноўленым заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах.*

2.16. “***16. Звесткі аб прыняцці ў эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, на якой выконваліся рамонтна-рэстаўрацыйныя работы***” запаўняюцца ў адпаведнасці з заключэннем аб адпаведнасці прымаемай у эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, якое выдадзена ў адпаведнасці з заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах.

**Напрыклад:**

| Назва аб'екта згодна з праектнай дакументацыяй | Дата і нумар заключэння аб адпаведнасці прымаемай у эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях | Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) грамадзяніна, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, які ажыццяўляў кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях, установа, дзе ён працуе, яе адрас і тэлефон |
|---|---|---|
| “Капітальны рамонт жылога дома па вул. Камсамольская, 14 у г. Пінску” | Заключэнне Міністэрства культуры ад 1 лютага 2023 г. № 04-01-07/4 | Карсунова Святлана Юр’еўна, Філіял “Брэстрэстаўрацыяпраект” ААТ “Белрэстаўрацыя” 224005 г. Брэст, вул. Камсамольская, 38 тэл. +375 162 252301 |

*Даведачна: З 01.01.2023 у адпаведнасці з артыкулам 120 Кодэкса ў выпадках і парадку, устаноўленых заканадаўствам аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, юрыдычным асобам, грамадзянам, у тым ліку індывідуальным прадпрымальнікам, выдаецца заключэнне аб адпаведнасці прымаемай у эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці навукова-праектнай дакументацыі згодна з заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах:*

*2.1.* ***Міністэрствам культуры*** *- у дачыненні да нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей* ***катэгорыі “0”, “1”, “2”****;*

*2.2.* ***мясцовым выканаўчым і распарадчым органам абласнога тэрытарыяльнага ўзроўню*** *- у дачыненні да нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей* ***катэгорыі “3”****.*

*Пералік грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, якія маюць* ***пасведчанне на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі*** *для выканання рамонтна-рэстаўрацыйных работ матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей размешчаны ў раздзеле “Спадчына” сайта Міністэрства культуры па спасылцы:* **kultura.by/be/nasledie/**.

2.17. У рэквізіце “***Звесткі аб праекце зон аховы (для нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці)***” запаўняецца дата і нумар пастановы Міністэрства культуры, якой зацверджаны праект зон аховы нерухомай матэрыяльнай ГКК, яго назва.

*Даведачна: Звесткі аб зацверджаных праектах зон аховы ГКК утрымліваюцца на Нацыянальным правовым Інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь (pravo.by), а таксама даводзяцца да ведама распрацоўшчыка і адпаведнага выканкама згодна з пунктам 47 Інструкцыі аб парадку распрацоўкі праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных ГКК, зацверджанай пастановай Міністэрства культуры ад 06.07.2022 № 52.*

У выпадку, калі на момант запаўнення пашпарта праект зон аховы ГКК не распрацаваны, дадзены рэквізіт не запаўняецца.

2.18. “***Ілюстрацыйныя матэрыялы на ____ лістах***”

Ілюстрацыйны матэрыял павінен адлюстроўваць выгляд ГКК і яе размяшчэнне ў навакольным асяроддзі цалкам, быць падпісаным, пранумараваным і каляровым.

Фатаграфаванне аб’екта спадчыны павінна ажыццяўляцца з усіх бакоў, а таксама з розных ракурсаў, якія дазваляюць найбольш поўна перадаць яго адметныя вартасці, а таксама асаблівасці размяшчэння гэтай ГКК у навакольным асяроддзі.

На фотаздымках падлягаюць адлюстраванню адметныя мастацкія, дакументальныя, архітэктурныя і (або) канструктыўныя вартасці матэрыяльнай ГКК, а таксама элементы, канструкцыі, дэталі, якія падлягаюць абавязковаму захаванню і пазначаюцца ў пункце 11 пашпарта.

У ілюстрацыйны матэрыял таксама ўключаецца графічны матэрыял (карты, схемы, планы) і іншы матэрыял (копіі гістарычных дакументаў, ілюстрацыі гістарычных падзей і асоб, фотаздымкі і выявы ГКК на розных этапах развіцця ГКК, правядзення работ), які мае дачыненне да ГКК. Пры размяшчэнні карт абазначаюцца межы ГКК. Рэкамендуецца выкарыстоўваць матэрыялы спецыяльных дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў (map.nca.by, gismap.by, heritage.gov.by, gzk.nca.by і г. д.).

2.19. У рэквізіце “***Дадатковыя звесткі аб падзеях і асобах, звязаных з матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю***” апісваюцца гістарычныя падзеі, біяграфіі асоб, звязаныя з ГКК.

2.20. У рэквізіце “***Пашпарт складзены***” ўказваецца дата складання пашпарта, поўнасцю запаўняецца пасада, прозвішча, імя, імя па бацьку

асобы, якая запоўніла пашпарт, прастаўляецца асабісты подпіс адзначанай асобай.

**3. Запаўненне ліста змяненняў.**

3.1 У рэквізіце “***Назва***” рэкамендуецца пазначаць назву, месца знаходжанне і шыфр ГКК згодна з Дзяржспісам (gosspisok.gov.by).

3.2. “***Дата ўнясення змянення***” ўказваецца з улікам патрабаванняў пункта 8 артыкула 100 Кодэкса, якім прадугледжана запаўненне ліста змяненяў не пазней за сем каляндарных дзён з моманту паступлення звестак у мясцовы выканаўчы і распарадчы орган (па аналогіі з тэрмінам інфармавання Міністэрства культуры аб падпісанні новага ахоўнага абавязацельства, устаноўленага пункта 1 артыкула 121 Кодэкса).

*Даведачна: У выпадку падпісання новага ахоўнага абавязацельства мясцовы выканаўчы і распарадчы орган забяспечвае адначасовае накіраванне звестак аб новым ахоўным абавязацельтсве і экзэмпляра афармленага ліст змяненняў у пункт 9 пашпарта ў Міністэрства культуры.*

3.3. “***Падставы для ўнясення змянення***”.

У якасці падстаў для ўнясення змяненняў указваюцца пункты 7–9 артыкула 100, пункта 1 артыкула 121 Кодэкса, а таксама іншыя нарматыўныя прававыя акты.

**Напрыклад:**

пункты 7–9 артыкула 100 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, падпункт 2.2 пункта 2 пастановы Міністэрства культуры ад 20.08.2021 № 55.

3.4. Рэквізіты “***Пункт пашпарта матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, у які ўносіцца змяненне***”, “***Змест змянення***”.

Звяртаем увагу, што разам з пашпартамі складзенымі пасля 23.03.2017 па форме, зацверджанай пастановай Міністэрства культуры ад 28.12.2016 № 89 (рэд. ад 24.11.2022), юрыдычную сілу маюць пашпарты, складзеныя ў перыяд з 2006 па 22.03.2017 па форме, зацверджанай пастановай Міністэрства культуры ад 08.12.2006 № 40.

З улікам адзначанага ўказваецца адпаведны пункт пашпарт складзенага ў перыяд з 2006 па 22.03.2017 ці ў перыяд пасля 23.03.2017.

Змест змянення афамляецца ў выглядзе тэкставага апісання або ілюстрацыйнага матэрыяла.

Пункты пашпарта, прадстаўленыя ў пашпарце ў форме табліц (звесткі аб сучасным і гістарычным адрасе, гісторыі развіцця, звесткі аб уласніку, лакалізацыі валодання, даце наступлення (заканчэння) правоў уласнасці і ахоўным абавязацельстве, тэхнічныя характарыстыкі і інш.), рэкамендуецца ў лісце змяненняў выкладаць поўнасцю ў новай рэдакцыі.

**Напрыклад:**

***Пункт 9***

| 9. Уласнік (карыстальнік) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, | Лакалізацыя валодання | Форма ўласнасці | Дата наступлення/ заканчэння | Ахоўнае абавязацельства (дата і нумар |
|---|---|---|---|---|

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| землекарыстальнік, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць | | | правоў уласнасці | рэгістрацыі) |
| Аддзел культуры Стаўбцоўскага райвыканкама | увесь комплекс | камунальная | 28.02.2002 | 09.01.2007 № 71<br>14.06.2010 № 11-02-07/571 |
| Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Стаўбцоўскага райвыканкама | увесь комплекс | камунальная | 2013 | 31.12.2013<br>№ 11-02-07/2109<br>11.05.2018<br>№ 6/19/1-16/7 |

Пры ўнясенні змянняў у некалькі пунктаў пашпарта дадзеныя пункты выкладаюцца згодна з парадкавымі нумарамі.

3.5. "***Асоба, упаўнаважаная мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, якая ажыццявіла ўнясенне змянення***"

Асобу, якая ажыццяўляе ўнясенне змяненняў, неабходна фіксаваць з выкладаннем пасады ў адпаведнасці з рашэннем мясцовага і распарадчага органа базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, якім дадзеная асоба ўпаўнаважана на ўнясенне змяненняў у пашпарт.

Ліст змяненняў павінен змяшчаць пятачку юрыдычнай асобы, якая ўпаўнаважана на ўнясенне змяненняў у адпаведнасці з рашэннем мясцовага і распарадчага органа базавага тэрытарыяльнага ўзроўню.

3.6. Пры афармленні ліста змяненняў рэкамендуецца абагульняць і ўносіць актуальныя змяненні па ўсім пунктам пашпарта, у тым ліку гісторыі змянення адрасоў, апісанні ГКК, гістарычнай даведцы, работах, якія ажыццяўляліся за ўвесь перыяд з даты першапачатковага складання адпаведнага пашпарта, распрацоўцы навукова-праектнай дакументацыі, праекта зон ахоры і сучасным знешнім выглядзе ГКК. З улікам адзначана, ліст змяненняў можа ўтрымліваць некалькі пунктаў пашпарта, у якія ўносяцца змяненні.

У выпадку, калі новыя звесткі ў лісце змяненняў перавышаюць 50% аб’ема інфармацыі пашпарта, асобе, якая ажыццяўляе ўнясенне змяненняў, мэтазгодна запоўніць новы пашпарт.